4. Пронь, С.В. Міднародні відносннн та зовнішня иолітнка: навчальиий иосібннк / С.В. Пронь. – Мнколаїв: Внд-во МДГУ ім. Петра Могнлн, 2009. – 140 с.
5. Ллойд Джордж, Д. Правда о мирных договорах: в 2-х т. / Д. Ллойд Джордж. – М.: Изд-во нностранной лнтературы, 1957. – Т. 2. – 556 с.
6. Всесвітня історія: Навч. иосібннк / Б.М. Гончар, М.Ю. Кознцькнй, В.М. Мордвінцев, А.Г. Слюсаренко. – 3-тє внд. – Кнїв: Знання, 2007. – 694 с.
7. Снстемная нстория международных отношенні в двух томах / иод ред. А.Д. Богатурова. – М.: Культурная революция, 2009. – Т. 1. События 1918 – 1945 годов. – 480 с.
8. Японня: Справочннк / Под общ. ред. Г.Ф. Кнма н др. – М.: Республика. 1992. – 543 с.
9. Пронь, С.В., Шевельов, В.М. Новітня історія країн Єврони та Америки. 1917–1995 рр. / С.В. Пронь, В.М. Шевельов. – Навчальннй иосібннк. – Миколаїв: Жовтнева друкарня, 1996. – 256 с.
10. Masamichi, R. The History of the Japanese Foreign Policy, 1914 – 1939 / R. Masamichi. – Tokyo, 1941. – 308 p.
11. Молодяков, В.Э. История Яионнн. XX век / В.Э. Молодяков, Э.В. Молодякова, С.Б. Маркарьян. – М.: ИВРАН; Крафт +, 2007. – 528 с.
12. О'Коннор, Т.Э. Г.В. Чнчернн н советская внешняя иолитнка 1918 – 1930 гг. Пер. с англ. / Т.Э. О'Коннор. – М.: Прогресс, 1991. – 320 с.
13. Современные Соедннённые Штаты Амернкн: Энцнкл. справочннк. – М.: Полнтнздат, 1988. – 542 с.
14. Эйдус, Х.Т. Очеркн новой н новейшей нсторнн Японнн / Х.Т. Эйдус. – М.: Гос. изд-во иолит. лит-ры, 1955. – 335 с.

# ПАЧАТКОВЫ ЭТАП ТРАНСФАРМАЦЫІ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ І КРАІНЫ ЦЭНТРАЛЬНА-УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

М.М. Мязга (Гомель)

Рурскі крызіс наглядна прадэманстраваў, што палітыка ўльтыматумаў у дачыненні да пераможанай у Першай сусветнай вайне Германіі з'яўляецца малаэфектыўнай і з яе дапамогай цяжка дабіцца выканання шэрагу палажэнняў Версальскага дагавора. У парадак дня было пастаўлена пытанне аб паступовай трансфармацыі Версальскай сістэмы. Яе мэта заключалася ў тым, каб, пры захаванні ў цэлым таго міжнароднага парадку, які ўсталяваў Версальскі дагавор, дасягнуць пэўнага кампрамісу з Германіяй па пытаннях, якія для яе з'яўляліся найбольш непрымальнымі, і вярнуць яе ў канцэрт еўрапейскіх дзяржаў. Намячаўшыеся змены ў Версальскай сістэме ў вялікай ступені закраналі інтарэсы краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Першым істотным крокам у справе трансфармацыі Версальскай сістэмы стала распрацоўка і прыняцце плана Даўэса, а таксама заява Германіі пра намер увайсці ў Лігу Нацый. Левыя ўрады, якія прыйшлі да ўлады ў Вялікабрытаніі і Францыі ў пачатку 1924 г., падтрымалі ўказаныя планы германскіх правячых колаў, адначасова пачаў працу камітэт экспертаў па распрацоўцы новага плана рэпарацый для Германіі. Гэтыя падзеі ўспрымаліся Польшчай і СССР па розных прычынах як неспрыяльныя для іх міжнароднага становішча.

Польская дыпламатыя адзначала, што з пачатку 1924 г. адбываецца ўмацаванне міжнародных пазіцый Германіі і стабілізацыя яе ўнутранай сітуацыі, а прыход да ўлады ў Вялікабрытаніі лейбарысцкага ўрада ствараў пагрозу рэвізіі Версальскага дгавора [1, ł. 23, 28–29]. Як адзін з варыянтаў нейтралізацыі негатыўных змен у міжнародным становішчы сваёй краіны польскія правячыя колы разглядалі паляпшэнне адносін з СССР. У лютым 1924 г. польскае міністэрства замежных спраў падрыхтавала мемарандум, у якім ставілася задача заключыць гандлёвы дагавор з СССР [2, ł. 90–92]. Аднак перамовы аб гандлёвым дагаворы вельмі хутка зайшлі ў тупік і былі перарваны ў канцы красавіка. У маі ўзнікла вострая дыскуссія паміж савецкім і польскім урадамі па пытанню аб нацыянальных меншасцях, што яшчэ больш ускладніла адносіны паміж дзвюма краінамі. Лета – восень 1924 г. былі часам, калі дасягнула кульмінацыі дзейнасць партызнскіх атрадаў, якія падтрымліваліся савецкімі ўладамі, на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Крэн Германіі ў бок збліжэння з Захадам адмоўна адбіўся на стане савецка-германскіх адносін. Найбольш яскравай ілюстрацыяй чаго стала правядзенне вобыску ў савецкім гандлёвым прадстаўніцтве ў Берліне 3 мая 1924 г. Аднак рапальскі курс вытрымаў выпрабаванне на трываласць, бо і СССР, і Германія былі ў той момант зацікаўлены ў яго захаванні. У выступленні на 13 з’ездзе РКП(б) Р. Зіноўеў адзначыў, што гісторыя з вобыскам у савецкім гандлёвым прадстаўніцтве “будзе толькі эпізодам у савецка-германскіх адносінах”, бо Германія вельмі зацікаўлена ў гандлі з СССР [3, с. 59]. Нам падаецца, што на праблему захавання палітыкі Рапала ў адносінах паміж СССР і Германіяй трэба глядзець больш шырока. Германскі ўрад выдатна разумеў, што супрацоўніцтва з СССР, па-першае, садзейнічае аднаўленню ваенна-эканамічнага патэнцыялу Германіі, а, па-другое, з’яўляецца інструментам ціску на краіны Захаду, каб дабіцца ад іх саступак у справе рэвізіі Версальскага дагавора.

З 16 ліпеня па 16 жніўня 1924 г. праходзіла міжнародная канферэнцыя ў Лондане. Яна зацвердзіла план Даўэса, што рабіла непазбежным хуткае ўзмацненне венна-эканамічнага патэнцыялу Германіі. На гэтай жа канферэнцыі было прынята рашэнне аб эвакуацыі Францыяй Рэйнскай зоны і актуалізавана пытанне аб уступленні Германіі ў Лігу Нацый. Г. Чычэрын у гэтай сувязі пісаў, што ўступленне Германіі ў Лігу Нацый без СССР азначала б яе далучэнне “да варожай нам групоўкі. Германія на роўных з іншымі членамі Лігі Нацый павінна была б падтрымаць Польшчу, Фінляндыю і гэтак далей у выпадку канфлікта з савецкімі рэспублікамі. Гэта канец Рапальскай сістэмы” [4, с. 237]. Нягледзячы на ўсе апасенні савецкай дыпламатыі, знешнепалітычны курс Г. Штрэзамана не стаў накіраваным выключна

ў бок Захаду. Ён імкнуўся захаваць раўнавагу паміж палітыкай збліжэння з Захадам і рапальскім курсам, бо такая камбінацыя выглядала найбольш перспектыўнай у справе паступовага ажыццяўлення рэвізіі найбольш неспрыяльных для Германіі палажэнняў Версальскага дагавора. У выніку восенню 1924 г. савецка-германскія адносіны стабілізаваліся і бакі пачалі перамовы па шырокаму колу пытанняў.

У Польшчы намер Германіі ўступіць у Лігу Нацый таксама выклікаў трывогу. Асабліва непакоіла імкненне Берліна дабіцца для сябе агаворак па выкананню палажэнняў артыкула 16 статута Лігі Нацый, якія датычыліся ўдзелу ў санкцыях супраць агрэсара [2, ł. 101]. Наступствам неспрыяльных для Польшчы змен на міжнароднай арэне сталі новыя крокі яе кіраўніцтва па збліжэнню з СССР. У снежні 1924 г. была дасягнута дамоўленасць аб пачатку польска-савецкіх перамоў, якія былі нацэлены на падрыхтоўку палітычнага і эканамічнага пагадненняў [5, с. 344].

З пачатку 1925 г. цэнтральнае месца ў міжнароднай палітыцы займае пытанне падпісання Гарантыйнага пакта. 26 лютага міністр замежных спраў Польшчы А. Скшыньскі ў час выступлення перад дэпутатамі сейму падкрэсліў непрымальнасць для Польшчы Гарантыйнага пакта, калі ў ім не будуць гарантаваны ўсходнія граніцы Германіі. Вялікабрытанія рашуча выступала супраць уключэння такіх палажэнняў у Гарантыйны пакт. 18 сакавіка англійскі міністр замежных спраў О. Чэмберлен пісаў паслу ў Берліне: “Мы не возьмем на сябе ніякіх абавязацельстваў адносна якіх бы то не было граніц, акрамя граніц паміж Германіяй з аднаго боку і Францыяй і Бельгіяй з другога” [6, с. 182]. Пад ціскам Вялікабрытаніі і Францыя адмовілася падтрымаць пазіцыю Польшчы адносна Гарантыйнага пакта.

Неабходна адзначыць, што занепакоенасць польскага ўрада адносна гарантый граніц краіны не была безгрунтоўнай. У рашэнні палітбюро ад 18 снежня 1924 г. было заяўлена аб неабходнасці ў ходзе маючых пачацца перамоў з Польшчай не адмаўляцца ад прынцыпу выпраўлення граніц [7, с. 10]. Германія са свайго боку прапанавала зрабіць прадметам пачынаўшыхся савецка-германскіх перамоў пытанне аб адцясненні Польшчы да яе этнічных граніц. Г. Чычэрын у гутарцы з германскім паслом у цэлым станоўча паставіўся да гэтай прапановы [8, s. 11]. У студзені 1925 г. міністэрства замежных спраў Германіі падрыхтавала мемарандум, у якім у якасці бліжэйшай ставілася задача ліквідацыі найбольш непрымальных для Германіі пастаноў Версальскага дагавора адносна “польскага карыдора” і Верхняй Сілезіі [9, s. 35].

Падрыхтоўка Гарантыйнага пакта адмоўна ўплывала на савецка-германскія адносіны. Масква лічыла, што Германія, калі яна падпіша Гарантыйны дагавор і ўступіць у Лігу Нацый, далучыцца да антысавецкай групоўкі дзяржаў – пераможцаў у Першай сусветнай вайне і

стане на пазіцыю абароны Версальскага дагавора. У той жа час, як адзначалася ў мемарандуме савецкага ўрада ўраду Германіі ад 2 чэрвеня 1925 г., у аснове рапальскай палітыкі ляжала непрызнанне СССР і Германіяй таго рэжыму, які быў усталяваны ў Еўропе серыяй пасляваенных дагавароў [10, с. 351]. Асаблівы клопат савецкага кіраўніцтва выклікала тое, што Гарантыйны пакт дасць дадатковыя міжнародныя гарантыі польска-германскай граніцы. Тым самым знікне адзін з важнейшых фактараў, на якім грунтавалася рапальская сістэма: сумеснае імкненне СССР і Германіі да перагляду польскіх граніц. Г. Штрэзаман прадставіў савецкаму ўраду мемарандум, у якім адзначалася, што ў праектуемым дагаворы аб гарантыях для ўсходніх граніц Германіі няма і мовы. Гэты ж тэзіс германскі міністр замежных спраў агучыў і ў гутарцы з савецкім паўпрадам у Берліне М. Крэсцінскім 15 красавіка 1925 г. [11, s. 512, 513]. Тым не менш, савецкае кіраўніцтва летам – у пачатку восені 1925 г. з вялікім недаверам ставілася да палітыкі Германіі, і ў савецка-германскіх адносінах назіралася яўнае пахаладанне, гандлёвыя і палітычныя перамовы не краналіся з месца [11, s. 519].

Аднак, Германія, хоць і рухалася да заключэння Гарантыйнага пакта і ўступлення ў Лігу Нацый, лічыла неабходным захаваць супрацоўніцтва з СССР як сродак паступовай рэвізіі Версальскай сістэмы. Савецкае кіраўніцтва ў такой сітуацыі імкнулася праз заключэнне новага пагаднення з Германіяй захаваць рапальскую сістэму. Пры гэтым Германію і СССР працягвала аб’ядноўваць імкненне да ліквідацыі Версальскай сістэмы. Красамоўнай з’яўляецца заява, якую ўтрымліваў даклад І. Сталіна на 14 съезде ВКП(б) у снежні 1925 г. Ён адзначаў, што Версальскі дагавор узаконіў, акрамя іншага, “страту ўкраінскай Галіцыі і Заходняй Валыні, страту Беларуссю заходняй яе часткі, страту Літвою Вільні і іншае» [12, с. 14]. Напрошваецца высновa аб несправядлівасці гэтых страт і неабходнасці гэтую несправядлівасць паправіць. Тым самым рушыліся надзеі польскай дыпламатыі на немагчымасць для Германіі спалучаць Рапала і Гарантыйны пакт [13, s. 335–339]. Пэўны ўплыў на пазіцыю Германіі аказаў і візіт у Варшаву Г. Чычэрына ў канцы верасня 1925 г., які быў успрыняты ў Берліне як пагроза савецка-польскага збліжэння. Пасля Варшавы савецкі наркам замежных спраў прыбыў у Берлін, і тут хутка была дасягнута згода па заключэнню гандлёвага дагавора, адноўлены перамовы адносна палітычнага дагавора. У час працы Лакарнскай канферэнцыі СССР і Германія падпісалі Маскоўскі гандлёвы дагавор.

Лакарнскія пагадненні сталі значным крокам на шляху паступовай мадэрнізацыі Версальскай сістэмы, якая істотна закранала краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гэтыя змены адмоўна ўплывалі на міжнароднае становішча перш за ўсё Польшчы. Яна не атрымала дадатковых міжнародных гарантый сваіх граніц і не змагла рэалізаваць пла-

ны иа развалу рапальскай сістэмы. Для СССР важна было захаваць "дух Рапала" ў адносінах з Германіяй ва ўмовах яе збліжэння з Захадам. Дадзеная задача была вырашана ираз заключэнне Берлінскага дагавора аб нейтралітэце. Германія з дапамогай иалітыкі "раўнавагі" иаміж усходам і захадам змагла ўмацаваць свае міжнародныя иазіцыі і дабілася иершых выгадных для сябе иерамен у Версальскай сістэме. Падпісанне Лакарнскіх иагадненняў і ўступленне ў хуткім часе Германіі ў Лігу Нацый азначала ирызнанне краінамі – иераможцамі яе ў якасці раўнапраўнага иартнёра і стварала юрыдычныя иадставы для мірнай рэвізіі иольска-германскай граніцы. Пры гэтым яна захавала ў якасці важнай апоры иры иравядзенні иалітыкі далейшай рэвізіі Версальскай сістэмы адносіны суирацоўніцтва з СССР на аснове Рапальскага дагавора.


1. Archiwum Akt Nowych. – Ambasada RP w Berline. – Sygn. 785.
2. Archiwum Akt Nowych. – Ministerstwo Spraw Zagranicznych. –Sygn. 6636.
3. Тринадцатый съезд РКП(б). Стенографический отчет. – М.: Госполитиздат, 1963. – 883 с.
4. Советско-германскне отношения. 1922–1925. Документы н матерналы: в 2 ч. – М.: Иолнтнздат, 1977. – Ч. 1. – 408 с.
5. Документы н матерналы ио нсторнн советско-иольских отношений: в 14 т. – М.: Наука, 1966. – Т. 4. – 559 с.
6. Турок, В. Локарно (5–16 октября 1925 г.) / В. Турок. – М.: Госиолитиздат, 1949. – 321 с.
7. Материалы «Особой иаики» Иолитбюро ЦК РКИ(б) – ВКП(б) ио воиросу советско-иольских отношений, 1923 – 1944 гг.: [Сб. документов] / Ред. И.И. Костюшко. – М.: ИСБ РАН, 1997. – 142 с.
8. Grosfeld, L. Polska a stosunki niemiecko-sowieckie. 1918–1939 / L. Grosfeld. – Warszawa: Niezależna Oficyna Wydawnicza, 1988. – 43 s.
9. Dokumente zur deutschen Geschichte 1919–1923: in 2 b. – Berlin: Deutscher Verl. der Wissenschaft, 1975. – B 2. – 104 s.
10. Документы внешней иолитики СССР: в 22 т. – М.: Госиздат, 1967. – Т. 8. – 862 с.
11. Stresemann, G. Vermachtnis / G. Stresemann: in 3 b. – Berlin: Ullstein von Henri Bernhard, 1932. – B. 2. – 611 s.
12. Четырнадцатый съезд ВКП(б). Стенографический отчет. – М.–Л.: Госнздат, 1926. – 789 с.
13. Dokumenty z dziejow polskiej polityki zagranicznej 1918–1938: w 2 t. – Warszawa: Inst. Wyd. Pax., 1989. – T. 1. – 540 s.


## РОЛЬ Г. ШТРЕЗЕМАНА ВО ВИЕШИЕЙ ПОЛИТИКЕ ВЕЙМАРСКОЙ РЕСПУБЛИКИ


Н.В. Силко, О.Г. Субботин (Минск)


Сложное внешнеиолитическое иоложение Веймарской ресиублики на иротяжении 1919 – 1924 гг. сопровождалось затяжным внутренним кризисом страны. Последствия Первой мировой войны, тяжелые для Веймарской ресиублики условия Версальского мирного договора, Рурский кризис, внутрииолитическая и экономическая нестабильность сказывались на внешней иолитике Германии.

Не случайно иериод с 1923 ио 1929 гг. в истории Веймарской ресиублики некоторые историки называют не иначе, как «эра Штре-